*Т.І. Васюк,*
*дацэнт кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# АРНАМЕНТАЛЬНАЕ ПІСЬМО І КАМПАЗІЦЫЙНЫЯ СІСТЭМЫ ЎЗОРАЎ НА ГЛІНЯНЫХ ВЫРАБАХ

Менавіта ў цэнтральным рэгіёне старажытнай Беларусі адбываўся ўзаемаўплыў культур яе паўднёвых і паўночных плямён, тым самым спрыяючы з'яўленню новых рысаў у археалагічных культурах, якія ў розныя старажытныя часы існавалі на тэрыторыі нашай краіны.

Абпаленыя на кастрышчах керамічныя вырабы на тэрыторыі цэнтральнага рэгіёну датуюцца неалітам, гэта каменны век. Уручную злепленыя грубаватыя керамічныя вырабы мелі прывабную фактуру і багаты арнаментальны дэкор. У наяўнасці сінтэтычная мастацкая вартасць.

Кераміка – гэта першы вынайдзены чалавекам матэрыял штучнага паходжання, у прыродзе ёсць сырая гліна, якая мае іншую структуру і якасць, чым цвёрды неабарачальны ў хімічным праяўленні матэрыял.

Да нашых дзён дайшлі толькі чарапкі, рэшткі вырабаў з далёкіх часоў каменнага, жалезнага і бронзавага вякоў. Важкі ўклад у візуалізацыю форм і дэкору керамічных сасудаў унеслі рэканструкцыя і рэстаўрацыя помнікаў археалогіі гісторыкамі, даследчыкамі, вучонымі, мастакамі-рэстаўратарамі і іншымі навукоўцамі.

Візуальная інфармацыя ў мастацкім плане зашыфравана ў рытмічных знаках арнаменту, які нанесены на керамічныя вырабы.

Актуальнасць даследавання геаметрычнага арнаменту ў кераміцы выклікана з'яўленнем у сучасным мастацтве плыняў нефігуратыўных геаметрычных пластычных форм. Іх вывучэнне спрыяе пашыранаму даследаванню каранёў і першакрыніц у мастацтве, яго першапачатковых увасабленняў.

У дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі геаметрычны арнамент складае асноўную сюжэтную лінію ў тэкстылі, дрэве, кераміцы, метале. Гэты напрамак мастацтва добра захаваўся да нашых дзён. Керамічныя вырабы са знакавым геаметрычным узорам класіфікуюцца па асаблівасцях формаўтварэння: конусныя; цыліндрычныя; акруглыя; шаравідныя; камбінаваныя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першабытных нашых продкаў у асноўным было іншае ўспрыманне свету. Некаторыя вучоныя тыя далёкія часы называюць «дзяцінствам чалавецтва», калі ўяўленні аб свеце і сусвеце ўвасабляліся простымі знакамі думка-вобразаў аб з'явах прыроды і чалавеку. Рыскі, ямачкі, наколы, штрыхі, лініі, паглыбленні былі арганізаваны пэўным парадкам у сістэму. У візуальную сістэму арнаменту ўключаюцца патаўшчэнні венчыку, налепы, валікі, зашчыпы, паглыбленні, ямачкі, фактуры, форма вырабу. Выраб з гліны створаны па прынцыпу сінтэтычнай еднасці, мае мастацкую каштоўнасць. У мэтах нашага артыкула – менавіта этычная праява геаметрычных рытмаў і форм візуальнай сістэмы арнаменту, якая ўключае патаўшчэнні венчыку, рыскі, налепы, валікі, фактуры, зашчэпы, ямачкі, наколы, паглыбленні.

Навука аб мастацтве шукае заканамернасці ўвасаблення пэўных элементаў у рэч мастацкага значэння, што ўтварае стыль, які ёсць грунт у мастацтве і найперш цікавіць сённяшніх навукоўцаў, а таксама практыкаў.

Археалагічная культура – гэта агульнасць помнікаў, што існавалі на акрэсленай тэрыторыі прыкладна ў адзін час. Сярэднедняпроўская культура часткова кранае цэнтральны рэгіён. Для яе характэрны акруглыя шарападобныя чашы, часам яйкападобныя формы пасудзін з адагнутым венчыкам і кароткай шыйкай.

Кампазіцыйныя структуры і напрамкі размяшчэння графічных арнаментальных узораў: гарызантальныя; вертыкальныя; дыяганальныя; суцэльныя; паясныя.

Пэўныя сістэмы элементаў утвараюць кампазіцыі: рамбападобныя; стужкавыя; трохкутныя; сеткавыя; камбінаваныя; зігзагападобныя; крыжападобныя; фігуратыўныя.

Метады дэкарыравання і нанясення арнаменту на сырую гліну: штампам; пальцамі рукі; шкуркай; тканінай; пляцёнкай; травой; грабенчыкам; лісцем і іншымі матэрыяламі.

Глінянае цеста ўжывалася з дамешкамі травы, пяску, каменчыкаў дробнага памолу.

Пасудзіны ўпрыгожваліся ў сырым стане гліны метадам наколаў, адбіткаў, рысак, штрыхоў. Дэкор падзяляўся на зоны: верхняя частка, сярэдняя і донца. Такая сістэма арнаментацыі захоўвалася ў кераміцы многіх культур. Верхняя частка вырабаў з гліны добра загладжвалася і глянцавалася (дзеля большай трываласці чарапка), а ўнутры часам рабіліся расчосы пры дапамозе грэбня. Відаць, гэты прыём ад культур далёкіх плямёнаў дайшоў да нашага часу. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

макотрах, цёрлах, макацёрках захаваліся шырокі венчык і расчосы ўнутры. У такіх пасудзінах церлі травы, сыр, мак… Прыём і тэхніка расчосвання не змяніліся і да нашых дзён.

На гарадзішчы пры зліцці рэк Пціч і Менкі, лічаць навукоўцы-ареолагі, першапачаткова паўстаў Мінск (каля сучаснай вёскі Гарадзішча, Мінскі раён). Гэта значны комплекс археалагічных помнікаў. Асаблівую мастацкую цікавасць па тэме геаметрычнага арнаменту ў кераміцы ўяўляюць помнікі культуры штрыхаванай керамікі. У розныя гады раскопкі і даследаванні рабілі: М. А. Ткачоў у 1970 г., Г. В. Штыхаў у 1976–1983 гг., А. М. Мяўданскі ў 1935 г., А.Н. Рынейскі ў 1930 г. і інш. Выяўлены цікавыя гістарычныя і археалагічныя звесткі аб культурах штрыхаванай і банцараўскай керамікі. Характэрная рыса штрыхаванай керамікі (Цэнтральная Беларусь і часткова Літва) – своеасаблівая арнаментацыя і фактура слоікаподобных цыліндрычных пасудзін з адагнутым венчыкам і шырокім вусцем. На пасудзінах адбіткі саломы ці травы, арнаментацыя размешчана ў верхняй часцы адкрытых пасудзін з акруглым донцам. Адчуваецца імкненне прафіляваць вырабы да дасканалай формы. Навукоўцы сцвярджаюць, што ў плямёнах посуд выраблялі жанчыны. Шырокагорлыя і вострадонныя пасудзіны дэкарыравалі разнастайнымі метадамі і прыёмамі. Цікавасць уяўляюць формы культуры лейкападобных кубкаў, шарападобных амфар і інш. Гэта багатыя арнаментальныя культуры неаліту.У бронзавым веку арнаментацыя амаль не змянілася. Сярэднедняпроўская культура шнуравая, прыбалтыйская, паўночнабеларуская, фацыянаўская, тшцінецкая, сосніцкая і лужніцкая культуры ўяуляюць сабой росквіт арнаментальнай керамікі.

Рытмы, пластыка, лепка так званай «грубай керамікі» яскрава адлюстравалі светаўспрыманне праз знакавую сістэму геаметрычнага арнаменту. Даследчыкі сцвярджаюць, што ромб у светаадчуванні нашых продкаў – гэта знак пажадання ўсім і сусвету дабра і дабрабыту, раўнавагі і суладдзя; рыскі, штрыхі, кропкі, трохкутнікі – таксама зашыфраваны тэкст добрай інфармацыі нам, нашчадкам, ад нашых продкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУКИ